стылістычныя фігуры кантрасту (аксюмаран, антытэза, амфітэза, антыменабала, акратэза, альтэрнатэза, дыятэза), так і сінтаксічныя канструкцыі (складаназлучаны сказ, складаны сказ з рознымі відамі сувязі, складаназалежны сказ).

## ЛІТАРАТУРА


1. Арнольд, И. В. Стилистика. Современный английский язык: Учебник для вузов / И. В. Арнольд. – 4-е изд., испр. и доп. – Москва : Флинта: Наука, 2002. – 384 с.

2. Разанаў, А. С. Такая і гэтакі: талакуе з маланкай дождж : пункціры / А. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2018. – 280 с.

3. Старасценка, Т. Я. Лексіка-стылістычныя сродкі рэалізацыі кантрасту (на матэрыяле твораў Алеся Разанава) : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : / Т. Я. Старасценка ; БДПУ імя Максіма Танка – Мінск, 2001. – 16 с.

4. Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т. 7. Беларуская мова / рэдкал. : У.У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2017. – 496 с.


УДК 821.161.3’373.2


Навуч. Ю.В. Дземянік

Навук. кір. Ж.В. Шкодзіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры

(ДУА «Вучэбна-педагагічны комплекс Ханявіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа»)


## КАТАЙКОНІМЫ СВІСЛАЦКАГА РАЁНА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ: СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ АНАЛІЗ

Значным накірункам сучаснай анамастыкі з’яўляецца вывучэнне асаблівасцей утварэння і функцыянавання назваў асоб паводле месца жыхарства. Катайконімы складаюць неад’емную частку словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы.

Актуальнасць даследавання такіх намінацый вызначана іх неўнармаванасцю, варыятыўнасцю, цікавасцю як спецыфічнага разраду ў сістэме словаўтварэння.

Практычная значнасць – паглыбленне даследаванняў па тапаніміцы, гісторыі малой радзімы, выкарыстанне на факультатыўных занятках па беларускай, рускай мовах, гісторыі, літарату, як аснова для складання слоўніка катайконімаў.

Аб’ект даследавання – катайконімы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці, прадмет даследавання – словаўтваральны аналіз назваў жыхароў пэўнай мясцовасці ў дадзеным рэгіёне.

Гіпотэза: утварэнне катайконімаў Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці, унікальнага ў лінгвакультуралагічных адносінах пласта лексікі, прадстаўлена асноўнымі словаўтваральнымі спосабамі сучаснай беларускай мовы.

Мэта – даследаваць катайконімы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці для правядзення іх словаўтваральнага аналізу.

Пастаўленая мэта дасягаецца праз наступныя задачы:

– разгледзець спосабы катайканімічнай намінацыі;

– правесці словаўтваральны аналіз катайконімаў Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці і скласці слоўнік «Катайконімы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці».

Былі выкарыстаны такія метады даследавання, як сацыялагічнае анкетаванне, зроблены кантэнт-аналіз, структурны аналіз, выкарыстаны апісальны метад.

У даследаванні прааналізаваны спосабы катайканімічнай намінацыі, зроблена класіфікацыя асноўных словаўтваральных тыпаў і мадэлей катайконімаў рэгіёна, устаноўлены найбольш прадуктыўныя, праведзены словаўтваральны аналіз. Для аналізу было выкарыстана 157 катайконімаў.

Такім чынам, аналіз сабранага фактычнага матэрыялу сведчыць, што катайконімы Свіслацка раёна Гродзенскай вобласці ўтвораны марфалагічным (суфіксальным і складана-суфіксальным) спосабам – 146 назваў – 93 % і прадстаўлены пэўнымі словаўтваральнымі тыпамі і мадэлямі. Найбольш прадуктыўнымі з’яўляюцца словаўтваральны тып з суфіксам -ц(ы) (66 назваў – 42%), прадстаўлены васьмю мадэлямі, самая прадуктыўная – аснова тапонімаў у форме множнага ліку на -ічы (ычы) + (ц)ы (27 назваў – 17,2%), а таксама словаўтваральны тып з суфіксамі -оўц-(ы),-аўц-(ы), -ёўц-(ы), -еўц-(ы) (64 назвы – 40,7%), прадстаўлены трыма мадэлямі, самая прадуктыўная – аснова тапонімаў у форме множнага ліку на -кі (41 назва –26,1%). Прадстаўлены катайконімы, утвораныя марфолага-сінтаксічным (3 назвы – 1,9%), сінтаксічным (2 назвы – 1,2%) і лексіка-семантычным спосабамі (6 назваў – 3,8%).

Назіраюцца пэўныя фанетычныя, словаўтваральныя, акцэнталагічныя змены. Характэрна такая з’ява, як аманімія: 21 назва – 13,4 %.

Цікавай з’явай з’яўляюцца рэгіянальныя катайконімы Свіслаччыны.

Такім чынам, зроблены словаўтваральны аналіз катайконімаў пацвярджае прапанаваную гіпотэзу.

Сабраны матэрыял зафіксаваны ў слоўніку «Катайконімы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці», які складаецца з 208 катайконімаў, з іх 47 рэгіянальных.

Тэма даследавання можа быць распрацавана далей: аналіз утварэння катайконімаў у форме мужчынска і жаночага роду адзіночнага ліку, параўнанне ўжывання іх у беларускай, рускай і замежнай (нямецкай) мовах, вывучэнне рэгіянальных катайконімаў – як сведчанне таго, што гэта жывы, цікавы і прадуктыўны, яшчэ не завершаны працэс.

УДК 811.161.3’373.232
Навуч. А.А. Еўлашэвіч
Навук. кіраўнік М.Г. Фурса, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА “Сярэдняя школа № 32 г.Гродна”)

## ГІСТОРЫЯ ЎЗНІКНЕННЯ, ПАХОДЖАННЯ І ІСНАВАННЯ НАШЫХ ІМЁН

Многіх людзей цікавіць, як узнікла іх імя, якую таямніцу хавае яно ў сабе. Ёсць жаданне даведацца аб гэтым і ў вучняў нашай школы. Па выніках анкетавання, праведзенага сярод хлопчыкаў і дзяўчынак (усяго было апытана 140 вучняў), стала вядома, што большасць з іх ужо цікавілася гісторыяй паходжання і значэннем свайго імя (82 вучні), астатнія жадаюць атрымаць такую інфармацыю. Некаторыя звярталіся да пошуку ў Інтэрнэце, але не змаглі знайсці дастатковых звестак. Адсюль вынікае актуальнасць нашай даследчай працы.

Аб’ектам праведзенага даследавання былі імёны вучняў нашай школы. Прадметам – гісторыя іх паходжання і ступень пашыранасці ў межах школы. Высветліць гісторыю іх узнікнення, падзяліць на групы па паходжанні і параўнаць матывы выбару імені ў старажытнасці і сучаснасці – было мэтай нашай даследчай працы.

Перш чым пачаць пошукі крыніцы паходжання імён вучняў нашай школы пазнаёміліся з кнігамі па беларускай антрапаніміцы В. Шура “Беларускія ўласныя імёны” [1] і У. Юрэвіча “Слова жывое, роднае, гаваркое” [2], з якіх даведаліся, што ў сістэме беларускіх імён і прозвішчаў шмат недаследаванага, “многа спрэчнага і не да канца вывучанага ў такіх пытаннях, як гісторыя і этымалогія асобных груп беларускіх імён, размежаванне ў сучаснай антрапанімічнай сістэме ўласна беларускіх (традыцыйных) і запазычаных слоў.” [2, с. 40].

Высветлілі, што матэрыялы розных слоўнікаў, этнаграфічных і гістарычных прац далі магчымасць даследчыкам прасачыць, як з назоўнікаў-архаізмаў, слоў-характарыстык, мянушак, царкоўных